Навык успешной коммуникации является одним из значимых компонентов обучения студентов-медиков. В 2021/2022 учебном году в Гомельском медицинском университете внедрена оценка коммуникативных навыков по методике «Стандартизированный пациент» в рамках изучения дисциплины «Профессиональные коммуникации». Сценарии для оценки коммуникативных навыков разрабатываются кафедрой общественного здоровья и здравоохранения при участии психологов.

В учреждении образования «Гомельский государственный медицинский университет» на медико-диагностическом и лечебном факультете активно развивается и внедряется практико-ориентированное и симуляционное обучение, с использованием информационно-коммуникационных технологий в процессе преподавания. Цифровизация – это неизбежное будущее нашей медицины, позволяющее современным студентам быть еще более прогрессивными, востребованными и конкурентноспособными специалистами.

**Литература**


1. Стариченко, Б. Е. Цифровизация образования: реалии и проблемы / Б. Е. Стариченко // Педагогическое образование в России. – 2020. – № 4. – С. 16–26. – DOI: 10.26170/po20-04-02.
2. Информатизация образования [Электронный ресурс] // Российская педагогическая энциклопедия. – Режим доступа: http://edmarket.digital/. – Дата доступа: 15.03.2018.
3. Влияние пандемии COVID-19 на сектор высшего образования и магистратуру [Электронный ресурс] : аналитический материал // Международный, национальный и институциональный ответ. – Режим доступа: https:// ntf.ru/sites/ default/files/ Vliyanie% 20pandemii% 20COVID19%20na%20sektor%20vysshego%20obrazovaniya%20i%20magistraturu.pdf. – Дата доступа: 30.12.2020.



***УДК 821.161.3-3***



***А. М. Мельнікава***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*


## ВЫХАВАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ТВОРАЎ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

Уладзімір Караткевіч – адзін з самых вядомых і папулярных беларускіх пісьменнікаў, творы якога валодаюць выключным выхаваўчым патэнцыялам. З творчасцю Ул. Караткевіча вучні сярэдняй школы пачынаюць знаёміцца ў 9 класе (аповесць "Дзікае паляванне караля Стаха") і працягваюць у 11 класе (вершы "Каложа", "Багдановічу", "Ты і я", "І тады закахалася хмара…"; раман "Каласы пад сярпом тваім"). Выбар гэтых твораў дае досыць аб'ектыўнае ўяўленне пра асноўную скіраванасць і спецыфіку творчасці пісьменніка.

Пры вывучэнні твораў Ул. Караткевіча варта акцэнтаваць увагу на наступных аспектах: асветніцкі патэнцыял, патрыятычны пафас, інтэлектуалізм, эстэтычная і эмацыянальная раззняволенасць, глыбіня думкі. Мэтазгодна падкрэсліць шырыню творчага дыяпазону Ул. Караткевіча: празаік, драматург, паэт, сцэнарыст, публіцыст. Таксама ў творчай спадчыне пісьменніка выдатныя нарысы, эсэ, казкі. Неабходна давесці вучням, што творчасць Ул. Караткевіча мае выключны ўплыў на развіццё беларускай літаратуры. Ул. Караткевіч фактычна з'яўляецца заснавальнікам гістарычнага і дэтэктыўнага жанраў у айчыннай літаратуры. Сёння гістарычная плынь – адна з самых значных у нацыянальным прыгожым пісьменстве. Многія пісьменнікі далучыліся да мастацкай творчасці менавіта пад уплывам Ул. Караткевіча. І не толькі аўтары твораў на гістарычную тэму. Шматлікія пісьменнікі ў сваіх інтэрв'ю адзначаюць, што штуршком для творчасці стала менавіта

знаёмства з напісаным Ул. Караткевічам. Менавіта творы Ул. Караткевіча пакладзены ў кантэкст Новай літаратурнай сітуацыі.

Творы Ул. Караткевіча – глыбокія, філасофскія, інтэлектуальныя. Яны валодаюць выключным выхаваўчым і асветніцкім патэнцыялам. Пісьменнік імкнуўся захапіць чытача беларускай гісторыяй, абудзіць цікавасць да мінулага сваёй радзімы, выхаваць патрыятычныя пачуцці. Беларусь у Ул. Караткевіча – краіна мужных, ахвярных мужчын і прыгожых, вытанчаных жанчын. Апалогіяй беларусу, які здольны пераадолець самыя неспрыяльным абставіны і выйсці пераможцам, з'яўляецца аповесць “Ладдзя Роспачы”. Услаўленнем беларусаў таксама стала аповесць “Сівая легенда”. Апавяданне ў творы вядзецца ад імя швейцарскага наёмніка Канрада Цхакена. Гэта традыцыйны прыём для мастацкай літаратуры – паказ краіны праз “погляд збоку”. Беларусы ў вачах Цхакена – верныя, высакародныя, мужныя, самаахвярныя. Аналагічныя выказванні пра беларусаў рассыпаны па іншых творах Ул. Караткевіча. Так, у рамане “Каласы пад сярпом тваім”: “Высокую іхнюю годнасць нішто не магло зламаць… Быў проста рахманы і вельмі мужны народ. Добры, верны сябрам і страшны ворагам, вольналюбівы, чысты і горды” [3, с. 329].

Творы Ул. Караткевіча маюць выключны асветніцкі патэнцыял. Ён імкнуўся ўкласці ў свае творы як мага больш звестак з беларускай гісторыі, культуры, этнаграфіі, спецыфікі побыту, каб адукаваць чытача. Своеасаблівай энцыклапедыяй Беларусі стаў нарыс “Зямля пед белымі крыламі”, перакладзены на шматлікія замежныя мовы.

Творы Ул. Караткевіча вучаць правільным адносінам да жыцця, вучаць годна пераадольваць цяжкасці, радавацца жыццю. Стары Вежа (раман “Каласы пад сярпом тваім”) гаворыць Алесю: “Жыццё – даброта. Найвялікшая даброта, якая дадзена кожнаму, нягледзячы на ўвесь боль…” [3, с. 241]. Словы аднаго з герояў апавядання Ул. Караткевіча “Барвяны шчыт” дакладна характарызуюць самога пісьменніка і ягонае ўспрыманне жыцця: “А ён любіў гэтую повязь з усім і усімі. З усімі вякамі і з усімі людзьмі, што былі, ёсць і будуць на зямлі. Гэта рабіла яго вялікім, значна вышэйшым за сярэдняга сябе” [1, с. 343]. Творы Ул. Караткевіча – крыніца аптымізму і натхнення. І сам пісьменнік быў аптымістам, закаханым у жыццё, людзей, прыроду.

Геніяльным раманам выхавання з'яўляецца раман “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”. Галоўны герой Юрась Братчык уздымаецца да ўсведамлення сябе заступнікам і абаронцам людзей, якія церпяць гвалт і несправядлівасць. Таксама гэта першы постмадэрнісцкі раман у беларускай літаратуры. Паказальна, што храналагічна з'яўленне гэтага твора супала са з'яўленнем постмадэрнізму ў еўрапейскіх літаратурах.

Героямі твораў Ул. Караткевіча з'яўляюцца людзі, якія не падпарадкоўваюцца абставінам, а абставіны падпарадкоўваюць сабе. Іх паводзіны вызначае кодэкс гонару: “…душа твая належыць толькі Богу і гэтым палям, шабля – ваяводзе справядлівай вайны, жыццё – усім добрым людзям, сэрца – каханай. Але гонар і чэсць – яны належаць толькі табе і больш нікому. Цябе пастрыгаюць у мужы, каб ты быў незалежны з моцнымі, братні – з роўнымі, памяркоўны і добры з ніжэйшымі” [2, с. 81]. Вядома, што самым любімым героем Караткевіча быў Кастусь Каліноўскі. Паўстанню пад кіраўніцтвам Каліноўскга прысвечаны самы маштабны раман пісьменніка “Каласы пад сярпом тваім”, а таксама апавяданне “Паляшук”, пралог да рамана “Нельга забыць”, вядомы пад назвай “Паром на бурнай рацэ”, аповесць “Зброя”, верш “Нявесце Каліноўскага”, драма “Кастусь Каліноўскі”.

Ул. Караткевіча вылучалі глыбокія веды ў галіне гісторыі, этнаграфіі, культуры Беларусі. Ён выдатна ведаў побыт шляхты і сялян, гараджан і вяскоўцаў, спецыфіку вопраткі і да т.п. Так, у рамане “Хрыстос прызямліўся ў Гародні” Ул. Караткевіч пералічыў сапраўдныя назвы вуліц сярэднявечнай Гародні: Кавальская, Мечная, Піўная, Калёсная, Адвеса, Абадранага Бабра, Страменная, Багамазная, ля Каложы, ля храма святой Ганны, ля храма Барыса і Глеба.

Сёння ўжо ледзь не класічнымі сталі радкі з аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха”, дзе апісаны беларускія стравы, а сярод іх такая экзатычная, як “ласіныя вусны ў

падсаложаным воцаце”. Таксама Ул. Караткевіч пастаянна ўзгадвае такі спецыфічны аксесуар беларускага жаночага касцюма, як караблік. У аповесці “Сівая легенда”: “І што лепей за ўсё – на галаве іхні «караблік», быццам ляжачы маладзік, быццам рожкі над вушамі. Рожкі тыя залацяцца, а на іх зверху накінуты рантух, зусім празрыстае блакітнае пакрывала паміж каленяў. Сядзіць, бы ў воблаку” [1, с. 13].

І канешне ж, творы Ул. Караткевіча прываблiваюць прыгожым і ўзнёслым апісаннем самых высокіх чалавечых пачуццяў: любові, кахання, сяброўства, вернасці сваім ідэалам. Таксама неабходна адначыць займальны сюжэт, майстэрства ў пабудове інтрыгі, драматызм, здольнасць трымаць увагу чытача. Творы пісьменніка вылучаюцца непаўторным гумарам.

Выбар вершаў, якія прапануюцца вучням для азнаямлення, таксама досыць паказальны. Вызначальная праблематыка твораў – патрыятычная, тэма кахання, мастацтва. Паэзію Ул. Караткевіча вылучае патрыятычны змест, інтэлектуальнасць, рытміка-інтанацыйная шматграннасць, пранікнёны лірызм. Аўтар у сваіх вершах узгадвае шматлікія мастацкія творы, імёны дзеячаў культуры, літаратуры, мастацтва. Вершы Ул. Караткевіча ўзнёслыя, рамантычныя, якім быў сам пісьменнік. Паэзія Ул. Караткевіча, як і ўся ягоная творчасць, мае жыццёсцвярджальнае гучанне.

### Літаратура

1. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1988. – Т. 2. : Аповесці, апавяданні. – 511 с.

2. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1989. – Т. 4. : Каласы пад сярпом тваім : раман, кн. 1. – 399 с.

3. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1989. – Т. 5. : Каласы пад сярпом тваім : раман, кн. 2. : Зброя : аповесць. – 527 с.

***УДК 378.1***

***Н. К. Мельников***
*г. Минск, Институт бизнеса БГУ*

## ПОТЕНЦИАЛ КРОССВОРДА В ИЗУЧЕНИИ ТЕРМИНОЛОГИИ ДИСЦИПЛИН УПРАВЛЕНЧЕСКОГО ПРОФИЛЯ

Вот уже более 100 лет в газетах и журналах мира публикуются словесные головоломки в виде кроссвордов. Появились многочисленные разновидности кроссвордов, которые имеют собственные правила составления и разгадывания. Феномен классического кроссворда состоит в том, что он, с одной стороны, может служить средством развития креативного мышления и поддержания когнитивного здоровья многих людей, а с другой стороны – быть предметом научных изысканий с по проблеме информационной безопасности [3].

Разгадывание кроссвордов неоднократно отмечалось преподавателями многих учебных дисциплин в качестве удобного метода освоения специальной терминологии как в рамках школьного, так и университетского образования [1]. При этом для разгадывания кроссвордов со специальными терминами используют чаще всего свободную кроссвордную сетку. Кроссворды могут создаваться как вручную, так и с применением доступных программных средств [2]. Вместе с тем потенциал использования кроссвордов для целей образования не ограничивается разгадыванием учебных кроссвордов. В настоящее время мало изучены методические вопросы использования кроссвордов в рамках концепции перевернутого класса, когда кроссворды составляют сами обучающиеся. Это во многом объясняется тем, что составление тематических кроссвордов на базе лексики учебного курса или его части по клас-